■ Падарожніку на заметку

# КАЛІ НЕ ВІЗА, ТО — ШТО?

## ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ НЕАБХОДНА ЎЗЯЦЬ З САБОЙ, ЕДУЧЫ НА СВЯТУЮ ЗЯМЛЮ

**Ізраіль нарэшце завяршыў унутраныя працэдуры па адмене віз з нашай краінай. Цяпер гэтую дзяржаву можна наведаць без паходаў у пасольства і збору дакументаў. Але ці дастаткова аднаго білета на самалёт? Па словах Дзмітрыя МІРОНЧЫКА, начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС, некаторыя дакументы падарожніку ўсё ж трэба мець з сабой.**

— Справа ў тым, што з адменай візавага рэжыму для ізраільскага боку кантроль уезду ў краіну пераносіцца, фактычна, з пасольства Ізраіля ў Мінску на мяжу, — адзначыў Дзмітрый Мірончык, — і яго будуць ажыццяўляць ужо непасрэдна пры ўездзе памежныя службы Ізраіля.

Менавіта ізраільскія міграцыйныя службы ўпаўнаважаны прымаць рашэнні аб дазволе альбо забароне на ўезд у сваю краіну замежным грамадзянам непасрэдна пры ажыццяўленні кантролю ў пунктах пропуску праз мяжу, у тым ліку на падставе асабістай гутаркі. Падчас яе высвятляецца адпаведнасць рэальных мэт паездкі і яе тэрмінаў.

— У сувязі з гэтым МЗС рэкамендуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь дакладна тлумачыць характар паездкі (турыстычная, гасцявая, дзелавая) і называць тэрміны свайго знаходжання ў Ізраілі, — праінфармаваў прэс-сакратар дыпламатычнага ведамства. — Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што прадстаўнікі памежнай службы могуць запатрабаваць дакументальнае пацверджанне прадстаўленых звестак. У сувязі з гэтым рэкамендуецца **мець пры сабе зваротныя білеты з фіксаванай датай, поліс медыцынскага страхавання, фінансавыя сродкі ў дастатковым аб'ёме (наяўная валюта, трэвел-чэкі, банкаўскія карткі).**

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# БЕЗ ЭЛЬДАРА РАЗАНАВА



Эльдара Разанава выказаў Прэзідэнт Беларусі.

У ноч на панядзелак, на 30 лістапада, пайшоў ад нас расійскі і савецкі кінарэжысёр Эльдар Разанаў. Нас чакае першая навагодняя ноч з яго «З лёгкай парай!», але без яго самога. Смех і сум. Сум і смех. Яго фільмы засталіся, а яго ўжо няма... Ён расказваў нам пра нас саміх з любоўю і болем, шчыра, і дарыў радасць, і рабіў нас трошкі больш добрымі, трошкі больш паэтычнымі... Ён любаваўся чалавекам, плакаў над ім, смяяўся і ўзносіў яго да нябёсаў.

*«Эльдар Аляксандравіч пакінуў яркае святло ў гісторыі савецкага і расійскага кінематографа як выдатны рэжысёр і майстар камедыйнага жанру. Яго творы заваявалі сэрцы многіх пакаленняў гледачоў сваёй мудрасцю і добрым юмарам»,* — такія словы спачування родным, блізкім і калегам народнага артыста СССР

■ Шпацыр па Камароўцы

# ЧАС ХУРМЫ, МАНДАРЫНАЎ

## І... ЛІСТАПАДАЎСКІХ КЛУБНІЦ

**Да Новага года яшчэ цэлы месяц, але прылаўкі, заваленыя хурмой ды мандарынамі — галоўнымі вітамінными прысмакамі зімовага сезона — ужо ствараюць святочны настрой. Сярэдні кошт вялікіх цвёрдых пладоў сорта «какі» складае 29 тысяч за кілаграм. Некаторыя прадаўцы аддаюць «веліканаў» і па 35 тысяч рублёў — эквівалент кілаграма памелы альбо перцу. Калі ж вы аматар «шакаладнага каралька», то кілаграм смакоцця аблегчыць ваш кашалёк на 26 тысяч рублёў. Будзьце ўважлівымі: мне прапаноўвалі ўзбекскіх «каралькоў» у два разы танней, але глядзець на гэтых пабітых жыццём «сірот» не хацелася.**

Ужо з'явіліся фейхоа — багатыя ёдам плады са смакам, падобным на мікс суніц, ананасаў і ківі. За кілаграм невялікіх зялёных «ягад» просяць 50 тысяч рублёў. За такую ж суму можна набыць паўтара авакада ці кіло грэцкіх арэхаў у шкарлупінах. Прастуду многія з нас выганяюць з дапамогай лімона. Кілаграм вітаміну С у цвёрдай абалонцы будзе каштаваць вам ад 25 да 32 тысяч рублёў. Даўкія грэйпфруты аддаюць па 55 тысяч рублёў за кіло. Салодкія мандарыны без костачак лепш выбіраць уважліва: іх сярэдні кошт не перавышае 26 тысяч рублёў, хоць можна адшукаць той жа прадукт і па 23 тысячы рублёў. Кілаграм апельсінаў без костачак каштуе на 9 тысяч даражэй. Варыянт з костачкамі абыдзецца вам у 28 тысяч рублёў за кіло. Самая бюджэтная заморская садавіна — гэта бананы. Іх максімальная цана — 17 тысяч рублёў за кілаграм.

На двух прылаўках раскінуліся журавіны — кіло за 38 альбо 42 тысячы рублёў. Шыкоўныя вялізныя гранаты ідуць у сярэднім па 28-35 тысяч за кілаграм. Дарэчы, за тыя ж грошы прапануюць і айчынныя «бэры», і ківі. Каля латка з ананасамі мне прачыталі невялікую лекцыю. Калі ўсе плады на выгляд амаль аднолькавыя, дык чаму на цэнніках бачу лічбы 35, 40, 50, 60 і 80?

— У нас засталося некалькі штук са старой партыі — іх аддаём па 40 тысяч рублёў за кілаграм. З новай партыі ёсць па 65 і 85 тысяч рублёў за кіло. Невялікія, але дужа салодкія — забірайце кілаграм за 50 тысяч рублёў. Маем і зусім маленькія, так званыя, бэбі-ананасы жоўтага колеру, але сёння не выкладвалі на прылавак, — тлумачыць шчодрая на словы прадаўшчыца.

Разабраўшыся з ананасамі, кідаю позірк на латкі з ягадамі. Чаго тут толькі няма! Ажыны мексіканскія — 150 тысяч за кілаграм. Жадаеце клубніц? Калі ласка, забірайце кілаграм галандскіх за 250 тысяч рублёў. Альбо кіло айвы за 85-100 тысяч рублёў. Надзівіўшыся на ягады па суперкоштах, вяртаюся да прылаўкаў з айчыннай садавінай. Беларускія яблыкі розных сартоў можна набыць па 12-25 тысяч рублёў.

Буракі і моркву прадаюць прыкладна па адным кошце — 10 тысяч за кілаграм. Бульба ёсць і па 5, і па 7 тысяч рублёў. Капусту можна набыць па 7-8 тысяч рублёў, квяцістую — за 15, а брокалі — за 30. Зяленіва — пятрушка, цыбуля, базілік, кроп — па 10 тысяч за 100-грамовы пучок. Цыбуля ідзе па 7-12 тысяч рублёў за кіло, чырвоная салодкая стане вашай за 35 тысяч рублёў. Напрыканцы шпацыру бойкая прадаўшчыца ўгаворвае ўзяць кавалак салодкага гарбуза — усяго 25 тысяч за кілаграм, хаця, па яе словах, яе калегі менш як за трыццатку свой тавар не аддаюць. Чаму б не ўзяць для восеньскага супчыку?

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

**Лічыльнік «Звязды»**
(кошты за кілаграм, калі не пазначана іншае)

| | |
|---|---|
| Сала хатняе салёнае — 110-145 тыс. | Сасіскі з мяса птушкі — 46 тыс. |
| Сала несалёнае — 100 тыс. | Каўбаса «Доктарская» — 90 тыс. |
| Сальцісон «святочны» — 70 тыс. | Кураня бройлернае — 29-30 тыс. |
| Грудзінка свіная па-сялянску — 130 тыс. | Сёмга слабасалёная — 450 тыс. |
| Палядвіца — 180-240 тыс. | Селядзец слабасалёны — 50-55 тыс. |
| Бужаніна (філе) — 95 -100 тыс. | Алей рафінаваны (0,9 л) — 23-25 тыс. |
| Фарш (свініна-цяляціна) — 63 тыс. | Грэчка (700 г) — 12 тыс. |
| Мяса труса — 120 тыс. | Яйка курынае Д-1 (дзясятак) — 17 тыс. |

■ Факт

## НЕБА КРЫЧЫЦЬ...

**Дабрачынны канцэрт пад такой назвай, скіраваны на падтрымку дзяцей і маладых людзей, хворых на аўтызм і сіндром Даўна, пройдзе 4 снежня ў Астраўцы.**

Такія канцэрты сталі ў раёне добрай традыцыяй: дзякуючы ім за пяць гадоў дапамогу аказалі больш як пяцідзесяці мясцовым жыхарам з рознымі захворваннямі. Прычым з кожным годам ахвотных дапамагчы становіцца ўсё больш. Аказаць матэрыяльную дапамогу дзецям і моладзі з вышэйназванымі хваробамі (іх на Астравеччыне 10 чалавек) можа кожны, набыўшы білет на канцэрт коштам 70 тысяч рублёў.

Акрамя таго, іх увазе ў фае кінаканцэртнай залы «Астравец» прапануюць выставу-продаж вырабаў мясцовых умельцаў, сярод якіх і маладыя людзі з інваліднасцю.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## ЗНОЎ КРЫЎДЗЯЦЬ СТАРЫХ

**Здаецца, зусім нядаўна ў Баранавічах пацярпелі даверлівыя пенсіянеры, якім махляры правялі датэрміновую «дэнамінацыю».**

І вось новае паведамленне Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці: заведзены дзве крымінальныя справы. Да 83-гадовага гараджаніна ў кватэру пастукалася жанчына, якая назвала сябе супрацоўніцай газавай службы. Яна паўгадзіны «правярала» газавае абсталяванне, уважліва аглядала ўсе закуткі і нешта занатоўвала ў сшытачку. Потым развіталася з гаспадаром і пайшла. Калі ж дамоў вярнулася жонка пацярпелага, то пенсіянеры выявілі прапажу 15 мільёнаў рублёў.

Тым часам да 67-гадовай гараджанкі зайшлі дзве жанчыны, якія прадставіліся супрацоўніцамі Чырвонага Крыжа. Яны запэўнілі, што збіраюць звесткі пра адзінокіх састарэлых грамадзян, каб потым аказваць ім дапамогу. Пенсіянерка даверліва расказала пра сябе, але калі няпрошаныя госці сыходзілі, заўважыла, што на лесвіцы іх чакала яшчэ адна візіцёрка, якая, відаць, прыкрывала саўдзельніц. Няцяжка здагадацца, што ў пенсіянеркі прапалі зберажэнні. Іх сума складае каля 10 мільёнаў рублёў.

**Афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Марына ДРАНЬКОВА** яшчэ раз папярэджвае старых людзей аб тым, што нельга адчыняць дзверы выпадковым людзям, а іх дзецям-унукам, маладым суседзям варта зноў нагадаць пра гэта пажылым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## «ПАЛЯВАННЕ» АМАЛЬ НА 400 млн

**Докшыцкі раённы суд разгледзеў справу пра незаконнае паляванне на тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка, заведзеную ў адносінах да жыхара вёскі Фядоркі. У мужчыны было знойдзена мяса лася.**

Падчас разбору высветлілася, што парушальнік пры дапамозе металічных сілаў здабыў у запаведніку двух ласёў. Суд прыгаварыў браканьера да 1,5 года пазбаўлення волі, штрафу ў памеры 18 мільёнаў рублёў і абавязаў пакрыць нанесеную шкоду — яшчэ 378 мільёнаў.

У круглую суму абышлося транспартаванне тушы казулі механізатару з Іванаўскага раёна. Жывёлу ён траўмаваў падчас уборкі на пшанічным полі. Па сцвярджэнні ветэрынара, выкліканага дзяржінспектарамі для агляду тушы, камбайн пашкодзіў толькі нагу жывёлы, іншая ж рана, ад якой і загінуў трафейны самец, хутчэй за ўсё, была нанесена нажом. Тушу казулі механізатар пагрузіў у машыну з зернем і даставіў дадому ў вёску Рудск.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Асцярожна!

# НЕБЯСПЕЧНАЯ ДАРОГА

**Снежнае надвор'е прынесла з сабой праблемы не толькі для камунальнікаў, але і для аўтамабілістаў. За пятніцу і выхадныя на тэрыторыі краіны адбылося 969 дарожна-транспартных здарэнняў. На жаль, 7 чалавек у іх загінулі, 52 атрымалі траўмы.**

Адна з самых страшных аварый адбылася каля вёскі Шчомысліца, што ў Мінскім раёне. Нядзельным ранкам 29-гадовы жыхар Фаніпаля не справіўся з кіраваннем аўто на заснежанай дарозе. На пагібельны вынік паўплывала і тое, што на машыне былі ўстаноўлены шыны з недастатковай вышынёй пратэктара, кіроўца, па сутнасці, не меў права ездзіць на «лысай» гуме. Яго занесла. У выніку машына з'ехала на абочыну і збіла 46-гадовага мінчаніна, які ў момант інцыдэнту выйшаў са свайго аўтамабіля. Яго шпіталізавалі ў бальніцу, але выратаваць жыццё не атрымалася. І падобныя наезды на пешаходаў для гэтых выхадных былі нярэдкасць. З 7 загінулых — 6 пешаходаў.

— Капрызлівае надвор'е ў выглядзе перападаў тэмпературы і рэзкай змены ападкаў робіць дарогу небяспечнай, — кажа **Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі.** — У такі час усім удзельнікам дарожнага руху трэба выконваць меры бяспекі. Падчас моцных ападкаў на дарозе трэба рухацца з уключаным блізкім святлом фар, выбіраць бяспечную хуткасць і дыстанцыю, з асаблівай асцярожнасцю ехаць па мастах, эстакадах і паблізу пешаходных пераходаў. Самае галоўнае на слізкай дарозе — ніякіх рэзкіх рухаў: пераскокаў, тармажэнняў, манеўраў. Варта дадаць, што ва ўмовах снегападаў і галалёдзіцы выкарыстанне веласіпедаў і мапедаў забаронена. Што тычыцца пешаходаў, не спрабуйце пераходзіць праезную частку па «зебры» перад транспартам, які рухаецца паблізу ад вас. Нават самы вопытны вадзіцель не здолее спыніць аўтамабіль імгненна. Тым больш на слізкай дарозе. Не лішнім будзе абазначыць сябе флікерамі. Нават у горадзе. Так кіроўцам будзе прасцей вас заўважыць.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*